Г. Ліхтаровіч (фотамастак, паэт)

# УСПАМІНЫ І ВЕРШЫ ПРА УЛАДЗІМІРА КАРПАВА

Добры дзень, шаноўнае спадарства!

Для мяне вялікі гонар прымаць удзел у вашай імпрэзе. Некалькі слоў пра сябе. Я па прафесіі фатограф, а па жыцці — удачлівы чалавек. Мне

шанцавала быць знаёмым з цудоўнымі і таленавітымі людзьмі, да ліку якіх адносіцца і Уладзімір Карпаў, з якім мяне пазнаёміў у свой час мой калега Віталій Бараноўскі…

Немагчыма забыць і нашы спрэчкі-пасядзелкі на самыя розныя тэмы, і абмеркаванні навуковых прац да кнігі Уладзіміра, і грыбныя вандроўкі па запаветных мясцінах Беларусі. Да сёння у памяці заўсёдны ўсмешлівы агеньчык у яго вачах, які не згасаў нават падчас сур’ёзных размоў…

Для мяне самога дзіўна, што я пачаў пісаць вершы, прычым у тым узросце, калі ужо паважаныя людзі пераходзяць на прозу. Ёсць у гэтым і доля «віны» Уладзіміра Карпава…

### ПАРТРЭТ

*Уладзіміру Карпаву*

Спрабую ўладкаваць усё ў санет –
Даруй мне апантанасць пачаткоўца.
Ты, можа, і вядомы навукоўца,
Ды сам казаў, што перш за ўсё — паэт!

І не стрымаць у спрэчках твой імпэт,
Бо ты не лезеш у кішэнь па слоўца.
Ёсць нешта ад зімовага ядлоўца:
Зірні ў люстэрка — пазнаеш партрэт?

Было спачатку, як вядома, Слова.
Ты з літараў ствараеш Свет нанова…
Але навука ўся — аблога рыфм!

Выснова, ад якой і сам дурэю, –
Нібыта местачковаму габрэю
Ў рахунак запісалі… лагарыфм!

Калі я ішоў у гэту аўдыторыю, мне на вочы трапіўся стэнд са словамі нашага славутага асветніка і першадрукара Францішка Скарыны. Менавіта гэтыя словы калісьці падштурхнулі мяне напісаць верш, які я хачу прапанаваць вашай увазе.

### ПОЛАЦКІ САНЕТ

Квітнее буквіц родны першацвет,
Нягледзячы на холад і прынуку.
Радкі як шлях — накшталт старога бруку –
Між забабонаў, прымхаў і прыкмет.

Мы ў гэты каламутна-творчы свет
Прыйшлі адтуль, з вытокаў кнігадруку.
Святло нам даў і добрую навуку
Скарынаў старадаўні запавет.

**7**
Набатам б’е і ў наш няўцямны час
Наказ, нібыта пісаны для нас:

Каб шанавалі мы свае вуллі
І ведалі святыя радаводы…
Асвета — соль бацькоўскае зямлі,
Падмурак нашай будучай свабоды!

Вялікі дзякуй за ўвагу.
Поспехаў і плёну ўсім удзельнікам “Карпаўскіх чытанняў”!